Настаўніцкая газета
11 чэрвеня 2016 года

**Вялікая ўвага ў нашым дашкольным цэнтры ўдзяляецца планаванню работы па азнаямленні дашкольнікаў з гісторыка-этнаграфічнай спадчынай Беларусі. Выхавальнікамі распрацаваны цыкл заняткаў "Чарадзейка гісторыя распавядае", мэта якіх — знаёмства з беларускай культурай, традыцыямі, абрадамі праз далучэнне дашкольнікаў да нацыянальных духоўных каштоўнасцей.**



# У гісторыю — з маленькай казкі



Не ў кожнага дзіцяці ёсць дзядулева вясковая хата, з якой магло б пачынацца чароўнае падарожжа ў гісторыю і культуру роднага краю. І гэта проста цуд, калі, апынуўшыся ў дашкольным цэнтры, малыш можа ўбачыць самы звычайны збан ці гладыш, вышыты ўмелымі бабулінымі рукамі ручнік, плеценыя з лазы кашы і саламяныя скрыні. Убачыўшы драўляную маслабойку ці прасніцу, малыя не ўстрымаюцца, каб не запытаць выхавальніцу, для чаго прызначаюцца гэтыя прылады, як імі карыстацца. А колькі казак можа дзіця пачуць пра стары серп, які вісіць на сцяне, пра тое, як з гліны нараджаецца кераміка, а са звычайных ільняных ці баваўняных нітак — прыгожая сукенка ці нават дыван! І добра, што яшчэ засталіся ўмельцы, якія самі вырабляюць усе гэтыя рэчы.

Ва ўстанове афармлены музейны куток "Беларуская хатка". Гэта дапамагае выхоўваць зацікаўленасць да агульначалавечай і нацыянальнай культуры, павагу да нацыянальных каштоўнасцей, садзейнічае пашырэнню ведаў аб навакольным свеце і аб самім сабе як прадстаўніку беларускай нацыі.

У музейным кутку праводзяцца тэматычныя заняткі, на якіх дзеці знаёмяцца з экспанатамі: прадметамі побыту, вопраткай, музычнымі прыладамі; дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам Беларусі; з традыцыямі беларускага народа. Малышы лепяць з гліны, у іх ёсць магчымасць вырабляць самыя простыя ўзоры з саломкі. Вынікі такіх заняткаў — вырабы з пластыліну, саломкі, гліны, паперы.

Не менш важнай умовай для фарміравання нацыянальнай самасвядомасці дзяцей дашкольнага ўзросту з'яўляецца цесная ўзаемасувязь з бацькамі. Гэтая работа актуальная, патрабуе вялікага такту і цярпення, бо ў маладых сем'ях пытанні выхавання патрыятызму, грамадзянскасці не лічацца важнымі і часта выклікаюць непаразуменне.

Цікава праходзяць у дашкольнай установе заняткі сямейных клубаў, якія ўключаюць у сябе работы фальклорнага плана, а таксама мясцовыя традыцыйныя святы і абрады.

Вялікае значэнне мы надаём сямейным экскурсіям па раёне, пасёлку, краіне, наведванню цікавых мерапрыемстваў і ўстаноў раёна.

І як гэта цудоўна, што ў выхавальнікаў ёсць магчымасць зрабіць першыя крокі сваіх выхаванцаў у культуру і гісторыю нашага краю прыгожымі і запамінальнымі! Вялікае жыццё пачынаецца з маленькага пакойчыка, вялікая гісторыя — з маленькай казкі, а культура — з памяці аб мінуўшчыне.

**Людміла ГУЛЕВІЧ,**
**выхавальнік дашкольнага цэнтра развіцця дзіцяці Елкі Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці.**